**Рэцэнзія**

**на даследчую работу "Музей каляндарна-абрадавых традыцый"**

**ДУА "Палатоўская дзіцячы садок-сярэдняя школа",**
**аўтар: Кабацкая А., кіраўнік: Качарагіна Л.А.**

Тэма даследвання прысвечана дзейнасці "Музея каляндарна-абрадавых традыцый", які быў створаны намаганнямі настаўнікаў і вучняў палатоўскай школы ў 2001 г. Актуальнасць дадзенага даследвання заключаецца ў тым, што дзейнасць музэя, арыентаванага на вувучэнне і захаванне рэгіянальных форм традыцыйнай культуры, мае вялікае значэнне не толькі ў вучэбным працэсе, але і з гледзішча выхавання моладзі ў духу сапраўднага патрыятызму. Трэба адзначыць, што дзейнасць музея з'яўляецца рознапланавай і ўключае сябе як збор этнаграфічных калекцый, пошукавую дзейнасць, правядзенне краязнаўчых даследванняў, экскурсійную і культурна-асветніцкую дзейнасць, што знайшло сваё адлюстраванне ў рэгіянальнай прэсе і было адзначана на шматлікіх рэспубліканскіх конкурсах.

Разам з тым, прадстаўленая работа ўяўляе сабой, хутчэй, справаздачу пра дзейнасць школьнага музея, але ўласна даследчыцкі кампанент выяўлены слаба, што адлюстравана ў вельмі сціслых раздзелах, якія ўтрымліваюць пералік зробленага без дастатковага аналізу і характарыстыкі далейшых перспектыў і праблемнага поля. Незразумелым застаецца і вынік даследчай і збіральніцкай дзейнасці: не пазначана колькасць экспанатаў розных катэгорый (кераміка, народны тэкстыль, рэчы побыту і г.д.) і адзінак фальклорных запісаў (віды, жанры), зробленых вучнямі і настаўнікамі.

Такім чынам, аўтар даследчай работа можа быць адзначаны ў рамках IX Краязнаўчых чытанняў навучэнцаў "Спадчына Полацкай зямлі" за актыўную краязнаўчую дзейнасць, але для праходжэння ў фінальную частку конкурса патрабуецца сур'ёзная змястоўная дапрацоўка работы.

Дацэнт кафедры гісторыі і турызму,
кандыдат гістарычных навук У.А. Лобач